УДК 373.3.035.6

# ФАРМІРАВАННЕ ГРАМАДЗЯНСКІХ ЯКАСЦЕЙ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

**Гарадзецкая Анастасія Ігараўна**
настаўнік пачатковых класаў ДУА "Гімназія г. Асіповічы"
г. Асіповічы, Рэспубліка Беларусь

**Анатацыя.** У дадзеным артыкуле асветлены пытанні патрыятычнага выхавання асобы малодшага школьніка, якая валодае якасцямі грамадзяніна, патрыёта і здольна паспяхова выконваць грамадзянскія абавязкі.

Вельмі важнай выхаваўчай задачай для нашай краіны ў сучаснай адукацыі з'яўляецца выхаванне ў дзяцей і навучэнцаў патрыятызму і грамадзянскасці, лепшых маральных якасцей.

Любоў да роднай краіны, роднага краю адыгрывае велізарную ролю ў станаўленні асобы дзіцяці. Без любові да Радзімы немагчыма пабудаваць моцную Беларусь. Без павагі да ўласнай гісторыі, да спраў і традыцый старэйшага пакалення нельга выгадаваць годных грамадзян. Без адраджэння нацыянальнага гонару, нацыянальнай вартасці нельга натхніць людзей на высокія справы. Гэтыя якасці павінны выхоўвацца з ранняга дзяцінства. Сапраўднымі патрыётамі і грамадзянамі не нараджаюцца, гэтыя якасці выхоўваюцца. Ва ўмовах дзейнасці калектыву ствараюцца грамадскія адносіны, дзе ў рэальным жыцці дзіця набывае канкрэтны грамадзянскі вопыт, вучыцца разуменню высокіх грамадзянска-патрыятычных пачуццяў: любові да Айчыны, пачуцця гонару за свой народ, яго гісторыю, традыцыі, культурныя дасягненні [1, с. 35].

З чаго пачынаецца выхаванне грамадзяніна? З прывіцця любві да родных мясцін – малой радзімы, яе гісторыі, людзей, харaства прыроды, бацькоўскага дома, краіны. Спадчына, якая нам дасталася ад продкаў,



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

цікавая і багатая на музычную культуру, традыцыі, стварае аўру дабрыні і павагі да кожнага чалавека.

Мая галоўная мэта як настаўніка пачатковых класаў па фарміраванні грамадзянскіх якасцей у сваіх выхаванцаў – гэта ўцягненне навучэнцаў, бацькоў, грамадскасці ў актыўную дзейнасць па патрыятычным выхаванні школьнікаў з мэтай фарміравання ў іх актыўнай жыццёвай пазіцыі, выхавання пачуцця гонару за свой народ, яго гісторыю, традыцыі, культурныя дасягненні.

Дадзеная мэта канкрэтызуецца праз наступную сістэму задач:

– падтрымка і развіццё пачуцця любові і павагі да сваёй зямлі, гістарычных каранёў і Радзімы, традыцый беларускага народа;

– паглыбленне ведаў аб дзяржаўнай сімволіцы (герб, сцяг, гімн Рэспублікі Беларусь), органах дзяржаўнага кіравання;

– выхаванне гонару за сацыяльна-эканамічныя дасягненні беларускай дзяржавы;

– фарміраванне інфармацыйнай культуры як кампанента разумення культуры сучаснага чалавека, умення крытычна ўспрымаць інфармацыю;

– выхаванне разумення сусветнай культуры.

Фарміраванне грамадзянскіх якасцей малодшых школьнікаў ажыццяўляецца мной праз выкарыстанне комплексу форм, метадаў, прыёмаў і сродкаў педагагічнай дзейнасці [2].

*Калектыўныя формы* педагагічнай дзейнасці:

– працоўныя і дабрачынныя акцыі (“Чысты клас”, “Чысты двор”, “Помнік”, “Падарунак для мам, бабуль”, “Пасадзім дрэўца”, “Міласэрнасць”);

– удзел у масавых мерапрыемствах і святах (“Прыйшлі калядкі з блінамі і аладкамі”, “Свята будучых абаронцаў Айчыны”, “Гуканне вясны”, “Весялосць на Масленіцу”, “Віншуем дарагую мамачку”, “Тата, мама і я – спартыўная сям’я”);

– паездкі, вандроўкі, экскурсіі (“Родны мой горад – Асіповічы”, “Музей майго горада”, “Дараганаўскі школьны комплексна-краязнаўчы музей”, “Мінск – сталіца Рэспублікі Беларусь”, “Цікава ведаць пра Дудуткі”, “Гістарычныя мясціны Беларусі”).

*Групавыя формы* дазваляюць вызначыць пазнавальны інтарэс кожнага навучэнца, дыферэнцыравана падысці да пэўных груп школьнікаў, больш поўна ўлічыць іх інтарэсы, запатрабаванні, своечасова выявіць асаблівасці:



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

– заняткі ў аб’яднаннях па інтарэсах, гуртках, секцыях (“Чароўная палітра”, “Тэатральны”, “Прынцэса гімнастыкі”, “Плаванне”, “Футбол”);

– заняткі ў дзяржаўных установах дадатковай адукацыі: музычнай школе і школе мастацтваў;

– факультатыўныя заняткі (“Мая Айчына”, “Вытокі роднай мовы”).

*Індывідуальныя формы* работы прадугледжваюць наступную дзейнасць вучняў:

– падрыхтоўка паведамленняў аб падзеях у нашай краіне, аб прыродзе роднага краю і выступленне на інфармацыйных і класных гадзінах (“Гістарычнае мінулае майго горада”, “Традыцыі беларускай сям’і”, “Беларусь спартыўная”, “Гераічныя песні беларусаў”, ”Чым славіцца беларуская зямля”, “Мы – беларусы”, “Сімвалы маёй краіны”, “Канстытуцыя – аснова дзяржавы”, “Роля і месца Рэспублікі Беларусь у сусвеце”);

– аказанне дапамогі састарэлым людзям;

– фатаграфаванне мясцін дзяцінства, прыроды роднага краю (“Аб чым можа паведаміць фотаздымак”);

– гутарак (“Ці ведаю родны край”, “Працаваць – значыць любіць і паважаць сваю краіну”, “Мая культура паводзін”, “Без родных і блізкіх не можа жыць чалавек”, “У вайны не жаночы твар”, “Нацыянальнае адзенне беларусаў”, “Пісьменнікі і паэты зямлі беларускай”, “Прырода роднага краю”);

– складанне і прэзентацыя сямейных радаводаў (“Традыцыі: утварэнне і існаванне”, “Радаслоўная маёй сям’і”);

– удзел у конкурсах і выставах (“Моўныя скарбы роднага краю: вусная народная творчасць”).

Складанасць і шматграннасць працэсу грамадзянскага выхавання малодшых школьнікаў патрабуе прымянення разнастайных метадаў арганізацыі іх дзейнасці:

– традыцыйныя метады: гутаркі, аповед, разважанне, работа з кнігай, перыядычным друкам (газета “Зорька”, часопіс “Юный спасатель”), прагляд відэафільмаў, пошук і адбор па зададзенай тэме інфармацыі ў інтэрнеце;

– актыўныя метады: ролевыя і дыдактычныя гульні, інтэлектуальныя аўкцыёны, “адкрыты мікрафон” (“Знайдзі Беларусь на карце”, “Роля правіл у жыцці чалавека”, “Якія мы ўсе розныя”, “Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь”);



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

– інтэрактыўныя метады: работа над праектамі (“Нашы мужныя землякі”, “Вулачкі – куфэрачкі майго горада”, “Чытаем і памятаем”, “Традыцыі маёй сям’і”).

Значны ўплыў на паспяховы ход любых заняткаў па азнаямленні малодшых школьнікаў са з’явамі грамадскага жыцця аказвае правільны адбор і спалучэнне разнастайных прыёмаў, найбольш эфектыўныя з якіх:

– разнастайны пачатак заняткаў (праблемная сітуацыя, слуханне песень, разгляд карцін, чытанне вершаў, прагляд відэаматэрыялаў);

– выкарыстанне параўнанняў і супастаўленняў: вуліца горада і вёскі, тэрыторыя горада і краіны, жыццё людзей у XX і XXI стагоддзях;

– гульнёвыя моманты;

– выкарыстанне элементаў беларускага фальклору;

– выказванне сваіх адносін да пэўнай з’явы, падзеі, іх ацэнка;

– работа са слоўнікамі.

Працэс фарміравання грамадзянскасці прадугледжвае выкарыстанне сістэмы сродкаў выхавання: матэрыяльна-тэхнічных (класныя пакоі для заняткаў, музеі, гістрарычныя і культурныя помнікі, сродкі масавай інфармацыі, творы літаратуры і мастацтва), адукацыйных (вучэбна-метадычныя комплексы, навукова-практычныя рэкамендацыі па грамадзянскім выхаванні), арганізацыйных (комплекс мерапрыемстваў, якія рэалізуюць задачы фарміравання і развіцця асобы грамадзяніна і патрыёта) [2, с. 72].

Кожная сям’я мае свае традыцыі, свой вопыт перадачы інфармацыі і духоўнага досведу ад пакалення да пакалення. Каштоўнасці сямейнага жыцця, засвоеныя немаўлятамі з першых гадоў жыцця, маюць вялікае значэнне для чалавека ў любым узросце.

Практычны вопыт дазволіў вызначыць асноўныя кірункі дзейнасці класнага кіраўніка:

– псіхолага-педагагічная асвета бацькоў;

– стварэнне ўмоў для спрыяльнага ўзаемадзеяння ўсіх удзельнікаў выхаваўчага працэсу: педагогаў, вучняў і іх бацькоў;

– уцягванне бацькоў у выхаваўчы працэс.

У якасці форм работы з сям’ёй выступаюць:

– тэматычныя бацькоўскія сходы (“Сямейныя традыцыі ў выхаванні малодшага школьніка”, “Выхаванне ў малодшых школьнікаў грамадзянскасці і патрыятызму сродкамі народнай педагогікі”, “Дружная праца – крыніца багацця. Сумесная карысная дзейнасць бацькоў і вучняў”, “Здаровы лад жыцця беларусаў”);

– індывідуальныя і тэматычныя кансультацыі;



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

– дні творчасці дзяцей і бацькоў;

– правядзенне сумесных пазакласных мерапрыемстваў (выставы, конкурсы, складанне свайго генеалагічнага дрэва, класныя гадзіны, працоўныя акцыі і дэсанты);

– прыцягненне бацькоў да правядзення экскурсій і паходаў, да арганізацыі паездак у тэатр, наведвання музеяў, правядзення сумесных свят.

Разгледжаныя формы, метады, прыёмы і сродкі выхаваўчай работы садзейнічаюць фарміраванню асобы, якая ўмее думаць самастойна і вырашаць розныя праблемы, валодае крытычным і творчым мысленнем, умее працаваць з інфармацыяй і набываць веды.

## Спіс літаратуры

1. Буткевіч, В. У. На парозе грамадзянскага сталення: методыка арганізацыі грамадзянскага выхавання вучняў пачатковых класаў : вучэбна-метадычны дапаможнік / В. У. Буткевіч, Н. Г. Ваніна, А. У. Талкачова. – Мінск : Пачатковая школа, 2004. – 96 с.

2. Козивец, Л. А. Теория и практика гражданского воспитания учащихся / Л. А. Козивец, Е. Ю. Крикало. – Мозырь : Содействие, 2006. – 143 с.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова